СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 20 (751) | Чацвер, 6 красавіка | 1944 г.

**ПРАЧЫТАЎ, ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ**

Днямі авіяцыя Чорнаморскага флота зрабіла налёт на порт Феадосія. Штурмавымі ўдарамі савецкія лётчыкі падавілі агонь некалькіх зянітных батарэй.

На днях авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота нанесла бомбавы ўдар па групе караблёў праціўніка ў Нарвскім заліве.

Усе нашы самалёты звярнуліся на свае аэрадромы.

## Слава чырвоным воінам

Кожны дзень па ўсяму свету разносяцца весткі аб бліскучых поспехах Чырвонай Арміі. Нашы войскі, ў цяжкіх умовах веснавога разводдзя, разбіваюць хвалёныя гітлераўскія полчышчы, ачышчаюць ад нямецкіх варвараў нашы гарады і сёлы.

Украінскія франты зангяршаюць ачышчэнне Украінскай і Малдаўскай Савецкіх Рэспублік, шырокім фронтам вышлі на Дзяржаўную граніцу СССР з Румыніяй, фарсіравалі раку Прут і праследуюць немцаў па румынскай тэрыторыі.

Нямецкія часці пад ударамі нашых войск кідаюць ваенную тэхніку, разбягаюцца, адбіраюць у сялян адзежу, пераадзяюцца ў яе і ў беспарадку, групамі і ў адзіночку, па калена ў гразі плятуцца на захад, трымаючыся за павозкі і за хвасты коней і валоў.

Толькі войскі 1-га Украінскага фронта з 4-га па 31 сакавіка знішчылі 183.310 і пленілі 24.950 нямецкіх салдат і афіцэраў, акружылі і дабіваюць у раёне Скала 15 нямецкіх дывізій.

Войскі 3-га Украінскага фронта з 6 па 16 сакавіка разбілі 6 нямецкую армію, пленілі 13.859 нямецкіх салдат і афіцэраў і забілі 35.800 немцаў.

Па загаду Вярхоўнага Галоўнакамандавання нашы войскі праследуюць ворага да яго поўнага разгрома і капітуляцыі.

Час канчатковай перамогі не далёк. Слава яе ўдзельнікам! Ганьба і пакута здраднікам Радзімы!

Падмацуем поспехі Чырвонай Арміі на фронце ўзмацненнем удараў па тылах ворага.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 31-га САКАВІКА ПА 5 КРАСАВІКА)

Войскі 1-га Украінскага фронта, працягваючы наступленне, занялі райцэнтр Каменец-Падольскай вобласці Дунаеўцы, райцэнтр Тарнопальскай вобласці Падгайцы, райцэнтры Станіслаўскай вобласці Косаў, Куты, Герца, райцэнтры Чэркавіцкай вобласці Навaселіца, Хоцін, райцэнтры Валынскай вобласці Гарохаў, Берасцечка, райцэнтр Львоўскай вобласці Лапацін, 180 другіх насялёных пунктаў і 11 чыгуначных станцый. У выніку імклівага наступлення ўдарных войск фронта ў раёне СКАЛА акружаны і знішчаюцца рэшткі 7 пяхотных, 7 танкавых і адной матарызаванай дывізіі немцаў. Праціўнік рабіў неадпаразовыя спробы вырвацца з акружэння, але быў адбіты і панёс вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. Войскі фронта, сціскаючы кальцо акружэння, занялі некалькі насялёных пунктаў. Толькі ў адным з іх захоплена 62 гарматы, звыш 400 аўтамашын і другія трафеі. Нашы войскі, блакіруючыя г. ТАРНОПАЛЬ, вялі наспяховыя баі па знішчэнню акружанага гарнізона праціўніка і авалодалі большай часткай горада. За тры дні вулічных баёў знішчана звыш 3.000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплена ў палон звыш 300 немцаў.

Некалькі дзён назад войскі 2-га Украінскага фронта на радзе ўчасткаў фарсіравалі р. ПРУТ і занялі на румынскай тэрыторыі звыш 50 насялёных пунктаў, ў тым ліку насялёны пункт Крыпіцый (13 км. паўночней Яссы) і чыгуначную станцыю Дзенжэніі, перарэзаўшы такім чынам чыгунку Яссы—Дарахай.

На Кішынёўскім напрамку нашы войскі занялі райцэнтры Малдаўскай ССР Рэзіна, Кіперчэны, 130 насялёных пунктаў і чыгуначную станцыю Шыпоцень, перарэзаўшы такім чынам чыгунку Кішынёў—Яссы.

На Тірaспальскім напрамку нашы войскі занялі райцэнтры Одэскай вобласці Катоўск, Ананьеў, Андрэева-Іванаўка, Троіцкае, Шыраева і 200 другіх насялёных пунктаў.

На Одэскім напрамку нашы войскі занялі горад і крэпасць Очакаў, райцэнтр Нікалаеўскай вобласці Тілігула—Берэзнянка (Суворава), райцэнтры Одэскай вобласці Бярозаўка, Красныя Окны, Валегацулава, Жоўцень, Фрунзаўка, Цэбрыкава, 460 другіх насялёных пунктаў і 12 чыгуначных станцый.

На другіх участках фронта ішлі баі мясцовага значэння.

За 5 дзён баёў на ўсіх франтах падбіта і знішчана 164 нямецкіх танкі, збіта 270 самалётаў праціўніка.

## Хроніка

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 сакавіка прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы тав. М. І. КАЛІНІНУ ў азнаменаванне 25-годдзя займаемага паста Старшыні ВЦВК і Старшыні Вярхоўнага Совета ССР.

## На абарону Савецкай Радзімы

У Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці па ініцыятыве калгаснікаў калгаса „Ленінскі Шлях“ распачаўся збор сродкаў на пабудову танкавай калоны „Адказ Рэчыцы“. Матка двух сыноў франтавікоў з гэтага калгаса Марыя Мітрафанаўна Кулік асабіста ўнесла 4.000 рублёў, калгаснік Ціхон Давідовіч унёс 5.000 рублёў. Усяго па раёну сабрана 2.350 тысяч рублёў. Збор працягваецца.

*** Па ініцыятыве камсамольцаў Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці распачаўся збор сродкаў на пабудову эскадрыллі самалётаў „Камсамолец Беларусі“. Ужо сабрана толькі ў адным Клімавіцкім раёне звыш 100.000 рублёў. Збор працягваецца.

## Не прайшло безнаказана

2 красавіка гітлераўскія бандыты ўварваліся ў вёску Зады Пухавіцкага раёну, да ніткі абрабавалі жыхароў, а вёску спалілі дашчэнту. Таксама было спалена некалькі будынкаў у вёсцы Кабылічы.

Але разбойнікам не ўдалося безнаказана ўбрацца ў сваё логава. Перахваціўшы іх у дарозе, партызаны забілі некалькі дзесяткаў фрыцаў. Астатнія немцы ўцяклі, пакінуўшы ўвесь абоз з нарабаваным сялянскім дабром.

Анатолі Б.

## Рознавіднасці культуры

Закарэнелая, нязменная дубінка ў фрыцавых руках—доказ толькі самага далікатнага абыходжання з нашымі людзьмі. Немцы, як і ў другіх захопленых імі краінах, хацелі прышчапіць нам сваю „культуру“ — акрамя дубінкі і мордабоя яны рэзалі кінжаламі, па разбойніцкі грабілі насельніцтва, бамбілі вёскі, гарады, упрыгожылі зямлю шыбеніцамі, адкрылі публічныя дамы, расстрэльвалі, палілі, жывымі закопвалі людзей, гвалтавалі, — адным словам, усімі сіламі даказвалі нашаму народу, што немцы стаяць на „высокім культурным“ узроўні.

Паследствы нямецкіх зверстваў адзначыў таварыш Сталін: „Ужо адно тое, што ў сваёй маральнай дэградацыі нямецкія захопнікі, страціўшы чалавечае аблічча, даўно ўжо калі да ўзроўня дзікіх звяроў,—ужо адны гэтыя абставіны гавораць за тое, што яны абрэклі сябе на немінучую гібель“.

Гітлераўцы самі сабе вынеслі смяротны прыгавор.

Цяпер труслівa ўцякаючыя „цывілізаваныя“ бандыты заклікаюць вочы народа правакацыямі. „Рада“ — прадажныя сабакі, ратуючыя сваю шкуру. „Краёвая абарона“ — гарматнае мяса пад нашы „Кацюшы“.

На вызваленай ад чужынцаў Савецкай Украіне нямецкаму „генеральнкамісару Украіны“ няма месца. Скора Готберг і Астроўскі таксама адправяцца кіраваць нябеснымі стадамі.

Нічога іх не выратуе ад адказнасці. Яны хацелі прышчапіць нашаму народу сваю інквізітарскую „культуру“. Яны разрушылі нашу культуру. На фронце Чырвоныя воіны частуюць фрыцаў шрапнэллю з свінцовай падліўкай па ўсім правілам сучаснай ваеннай культуры. Ад партызанскіх рук няпрошаныя госці ўзлятаюць у паветра разам з вантробамі. Гэта пачатак нямецкага канца.

Наш народ патрабуе ўзмездзя. За ўсе здзекі, злачынствы, забойствы, за разрушаны край, за ўсё адкажуць „цывілізаваныя“ людаеды Германіі. У нямецкім тылу савецкае насельніцтва ўносіць свае ўклады ў справу перамогі, прыбліжаючы час свайго вызвалення ад акупантаў.

Уладзімір Воланаў.

## Нямецкая „вярбоўка“

Награнуўшы ў нашу вёску, гітлераўскія варвары схапілі мужчын, у тым ліку і мяне, пагрузілі, як жывёлу, у машыны, завезлі на франтавую лінію ў раён горада П.

Там мы капалі акопы. Галодных, нас немцы білі чым папала, здзекаваліся, хто як хацеў. Ніколі не забуду, што я там перажыў.

Калі Чырвоная Армія прарвала нямецкую абарону я, скарыстаўшы паніку сярод немцаў, уцёк з некалькімі таварышамі.

Ад холаду, голаду і здзекаў я стаў калекай і выглядаю старыком. Нікому не раю пападацца ў лапы нямецкіх гадаў, калі ён не хоча згубіць жыццё.

ГЕРАСІМ К.,
селянін энскай вёскі.

## За граніцай

Амерыканскія і англійскія самалёты і ваенныя караблі высадзілі дэсантны атрад на югаслаўскі востраў Шолта.

*** У сувязі з наступленнем Чырвонай Арміі румынскія чыноўнікі, прадстаўнікі мясцовай улады і прамыслоўцы бягуць з паўночных раёнаў Румыніі ў глыбіню краіны. Тысячы такіх бежанцаў прыбылі ў апошнія дні з Ясс, Галаса і другіх раёнаў. Антанеску выдаў загад, па якім распаўсюджвальнікі трывожных слухаў расстрэльваюцца без суда.

*** За слуханне замежнага радыё ў Чэхаславакіі прыгавораны к смерці тры чалавекі.

*** У Рыо-дэ-Жанейро адбыўся парад першай Бразільскай экспедыцыйнай дывізіі.

*** На Ціхім акіяне дзейнічае больш 50 амерыканскіх авіяносцаў. Флот налічвае 3 мільёны матросаў і афіцэраў, кожны дзень ён папаўняецца 12 новымі караблямі.

*** На днях студэнты Парыжа ўстроілі дэманстрацыю пратэста супроць прымусовай адпраўкі ў Германію „лішніх студэнтаў“. Гітлераўцы прыбылі з спазненнем і не зрабілі ніводнага арышту.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б Друкарня газеты „Сталінец“. РЭДКАЛЕГІЯ.